Youthpass

Co-funded by the European Union

СТРАТЭГІЯ МОЛАДЗЕВАГА ПАШПАРТУ YOUTHPASS

Стратэгія прызнання і валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання ў моладзевай сферы ў ЕС

SALTO TRAINING & COOPERATION

EUROPEAN SOLIDARITY CORPS

Erasmus+
Enriching lives, opening minds.

Дадатковыя рэсурсы пра Моладзевы пашпарт Youthpass → www.youthpass.eu

ЗМЕСТ

1	Уводзіны	5
2	Палітычны кантэкст	8
3	Бачанне, мэты і задачы стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass	10
4	Трохі дэталяў пра Моладзевы пашпарт Youthpass	12
5	Роля і прырода Моладзевага пашпарту Youthpass у 2027 годзе	14
6	Сферы прымянення	16
7	Далейшае развіццё Youthpass як інструменту прызнання	25
8	Мэтавыя групы стратэгіі	28
9	Інструменты рэалізацыі стратэгіі	30
10	Рэалізатары	32
11	Кіраванне	34
12	Маніторынг, ацэнка і даследаванні	36
13	Распрацоўка стратэгіі і падзякі	39

Youthpass

1 УВОДЗІНЫ

У год публікацыі Стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass – 2021 – еўрапейская супольнасць моладзевай працы знаходзілася ў чаканні новых моладзевых праграмаў ЕС з усё больш разнастайнымі і шырокімі магчымасцямі для навучання і дзеяння для маладых людзей і моладзевых працаўнікоў. Мы таксама ў працэсе стварэння еўрапейскага парадку дня па працы з моладдзю і Бонскага працэсу – канцэнтраваных намаганняў супольнасці моладзевых працаўнікоў Еўропы для паляпшэння якасці, прызнання і інавацыяў у моладзевай працы. Нарэшце, у 2021 годзе мы, як і грамадства ў цэлым, усё яшчэ змагаемся з наступствамі пандэміі COVID-19. Акрамя таго, цягам некалькіх апошніх гадоў грамадства імкліва развівалася, дакладна як і тэмы, звязаныя з моладзевай працай, валанцёрствам, адукацыяй і светам працы. А пандэмія паскорыла многія з гэтых працэсаў і нават у пэўнай ступені пахіснула асновы і параметры моладзевай працы, валанцёрства і еўрапейскага супрацоўніцтва ў гэтых сферах.

Гэтыя ўсё больш складаныя і хутка зменлівыя часы ставяць **у цэнтр увагі значэнне кампетэнцыяў і варункаў, у якіх яны развіваюцца**. Важна павысіць бачнасць каштоўнасці нефармальнага і інфармальнага (спантаннага?) навучання ў моладзевай працы і валанцёрстве. Мы павінны зрабіць так, каб асобы, якія працуюць з моладдзю, разумелі адукацыйную каштоўнасць свайго досведу, і каб гэтая адукацыйная каштоўнасць дапасоўвалася да іншых працэсаў на еўрапейскім, нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, якія павышаюць бачнасць і дастасавальнасць кампетэнцыяў людзей, незалежна ад таго, дзе яны былі развітыя. Большасць еўрапейскіх краінаў маюць сістэмы для валідацыі навучання, здабытага ў нефармальных і інфармальных кантэкстах[1]. Аднак не заўсёды можа быць фактам, што гэтыя сістэмы ўлічваюць таксама кампетэнцыі, распрацаваныя ў кантэксце працы з моладдзю.

Тым не менш, нашы імкліва зменлівыя часы патрабуюць **пераасэнсавання кампетэнцыяў, неабходных у сучасным свеце, у прыватнасці, здольнасці вучыцца**. Гэтая здольнасць з'яўляецца **ключом да бесперапыннага развіцця асобы; яна спрашчае перадачу кампетэнцыяў у розных кантэкстах**, што асабліва важна ў хутка зменлівым свеце[2]. Навучыцца вучыцца набывае яшчэ больш важнае значэнне на фоне пандэміі, калі традыцыйныя варункі навучання і падтрымка навучання сутыкаюцца з выклікамі і ўзрастае патрэба ў здольнасці кіраваць уласным навучаннем.

Моладзевы пашпарт Youthpass - гэта сертыфікат і адукацыйны падыход, які дапамагае маладым людзям і моладзевым працаўнікам, якія ўдзельнічаюць у моладзевых праграмах ЕС, **стаць больш абазнанымі пра сваё навучанне і развіваць свае здольнасці вучыцца**. Гэта інструмент прызнання і валідацыі, які дапамагае ўдзельнікам дакументаваць кампетэнцыі, якія яны набылі, і, у сваю чаргу, прадстаўляць іх у адпаведных кантэкстах. З акцэнтам на індывідуальную падтрымку і развіццё, Youthpass **адаптаваны да моладзевай працы і валанцёрскіх праектаў**. Як такі, Youthpass спрыяе як пошукам адказу на актуальныя грамадскія выклікі ў больш шырокім сэнсе, так і працэсам фармавання палітыкі ў сферы працы з моладдзю, а таксама валідацыі нефармальнага ды інфармальнага навучання. Ён мае патэнцыял для заахвочвання большай сінергіі і павелічэння намаганняў па ўмацаванні навучальнага вымярэння працы з моладдзю.

[1] Commission Staff Working Document. → Evaluation of the Council Recommendation of 20 December 2012 on the Validation of Non-formal and Informal Learning.

[2] European Commission (2020) → LifeComp. The European Framework for Personal, Social and Learning to Learn Key Competence.

Стратэгія Моладзевага пашпарту Youthpass апісвае, як Youthpass можа захаваць і ўмацаваць сваю каштоўнасць у святле зменлівых патрэбаў і кантэкстаў сваіх мэтавых групаў і моладзевых праграмаў Еўрапейскага саюзу на 2021-2027 гады. Акрамя таго, яна спрыяе працэсам фармавання палітыкі ў сферы працы з моладдзю дзеля паляпшэння якасці і ўздзеяння працы з моладдзю і нефармальнага ды інфармальнага навучання ў Еўропе.

Гэты стратэгічны дакумент накіраваны на тое, каб служыць асновай для працы Рэсурснага цэнтру Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO T&C пры распрацоўцы Моладзевага пашпарту Youthpass разам з Еўрапейскай камісіяй і Нацыянальнымі агенцтвамі па моладзевых праграмах ЕС. Ён таксама імкнецца прапанаваць натхненне і рэкамендацыі для іншых арганізацыяў і зацікаўленых бакоў, якія жадаюць павысіць абазнанасць і бачнасць каштоўнасці навучання ў моладзевай працы і валанцёрстве па ўсёй Еўропе.

2 ПАЛІТЫЧНЫ КАНТЭКСТ

Стратэгія Моладзевага пашпарту Youthpass абумоўленая наступным палітычным кантэкстам:

- Моладзевая стратэгія ЕС 2019-2027[3] заклікае да большага прызнання нефармальнага ды інфармальнага навучання ў працы з моладдзю, а таксама да больш сістэмнага выкарыстання і далейшага развіцця якасных інструментаў.

- Стратэгія Моладзевага пашпарту Youthpass мае на мэце садзейнічаць рэалізацыі Еўрапейскага парадку дня працы з моладдзю[4], стратэгічных рамак для інавацыяў, павышэння якасці і прызнання моладзевай працы ў Еўропе. Парадак дня, які будзе рэалізаваны ў рамках Бонскага працэсу, прызначаны для далейшай распрацоўкі стратэгіяў і дзеянняў, якія дазваляюць прызнаць і пацвердзіць нефармальнае і інфармальнае навучанне, атрыманае праз моладзевую працу, а таксама прызнаць уклад моладзевай працы ў пашырэнне правоў і магчымасцяў моладзі.

- Высновы Рады па адукацыі і навучанні моладзевых працаўнікоў (2019)[5] падкрэсліваюць неабходнасць прызнання разнастайнасці кампетэнцыяў моладзевых

[3] Resolution of the Council of the European Union and the Representatives of the Governments of the Member States meeting within the Council on a framework for European cooperation in the youth field:
→ The European Union Youth Strategy 2019-2027.

[4] Resolution of the Council and of the Representatives of the Governments of the Member States meeting within the Council on the Framework for
→ Establishing a European Youth Work Agenda.

[5] Conclusions of the Council and of the Representatives of the Governments of the Member States meeting within the Council on
→ Education and training of youth workers.

працаўнікоў і заклікаюць дзяржавы-чальцы і Камісію ўзмацніць прызнанне нефармальнага навучання ў моладзевай працы.

- Стратэгія сугучная з Еўрапейскім парадкам дня ў сферы навыкаў (European Skills Agenda) праз ацэнку Рэкамендацыі Рады ад 20 снежня 2012 года пра валідацыю нефармальнага і інфармальнага навучання[6]. Сярод іншых захадаў, ацэнка прадугледжвае больш дасканалыя метадычныя ўказанні для еўрапейскіх інструментаў празрыстасці, такіх як Europass і Youthpass, для ўзмацнення іх ролі ў працэсе валідацыі[7].

- Рэкамендацыя Рады Еўропы па працы з моладдзю[8] прапануе дзяржавам-чальцам садзейнічаць прызнанню каштоўнасцяў, ацэначных пазіцыяў, навыкаў, ведаў і крытычнага разумення, выпрацаваных шляхам удзелу ў моладзевай працы і яе правядзення, а таксама аказанню большай падтрымкі рэалізацыі існуючых і будучых еўрапейскіх рамак і парадкаў дня па прызнанні нефармальнага і інфармальнага навучання.

Моладзевы пашпарт Youthpass з'яўляецца часткай моладзевых праграмаў Еўрапейскага саюзу, гэта адзнака якасці, якая дапамагае павялічыць эфект для навучання ад удзелу ў гэтых праграмах. Юрыдычныя рамкі праграмаў Erasmus+ і Еўрапейскага корпусу салідарнасці 2021-2027 згадваюць Моладзевы пашпарт Youthpass як адзін з інструментаў і захадаў ЕС, якія спрыяюць павышэнню якасці праграм і пашырэнню прызнання развіцця кампетэнцыяў у кантэксце нефармальнага і інфармальнага навучання[9/10]. Ён рэалізуе рамкі ЕС у галіне ключавых кампетэнцыяў для навучання цягам усяго жыцця (2018)[11] і, такім чынам, звязаны з Еўрапейскай прасторай адукацыі[12].

[6] COUNCIL RECOMMENDATION of 20 December 2012 on the
→ Validation of non-formal and informal learning.

[7] European Commission (2020)
→ Study supporting the evaluation of the Council Recommendation of 20 December 2012 on the validation of non-formal and informal learning.

[8] Recommendation CM/Rec(2017)
→ 4 of the Committee of Ministers to member States on youth work.

[9] Regulation (EU) 2021/817 of the European Parliament and of the Council of 20 May 2021 establishing
→ Erasmus+: the Union Programme for education and training, youth and sport.

[10] Regulation (EU) 2021/888 of the European Parliament and of the Council of 20 May 2021 establishing
→ The European Solidarity Corps Programme.

[11] COUNCIL RECOMMENDATION of 22 May 2018 on key
→ Competences for lifelong learning.

[12] → European Education Area.

3

БАЧАННЕ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ СТРАТЭГІІ YOUTHPASS

Асноўнае бачанне Стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass - гэта пашырэнне бачнасці і разумення навучальнай каштоўнасці моладзевай працы, а таксама кампетэнцыяў, набытых праз удзел у моладзевых праграмах.

Стратэгія мае на мэце падтрымку маладых людзей і моладзевых працаўнікоў шляхам большага прызнання навучання ў кантэксце еўрапейскіх моладзевых праграмаў. Яна імкнецца садзейнічаць прызнанню вынікаў навучання ў гэтай сферы, у прыватнасці, набытых у рамках праграмаў Erasmus+ і Еўрапейскага корпусу салідарнасці.

Мэта 1:

Пашырыць прызнанне і валідацыю нефармальнага і інфармальнага навучання праз Моладзевы пашпарт Youthpass як адзнаку якасці моладзевых праграмаў ЕС..

Мэта 2:

Вызначыць кірунак для далейшага развіцця Моладзевага пашпарту Youthpass каб лепш прызнаваць навучанне праз моладзевыя праграмы ЕС, рэагаваць на зменлівыя патрэбы маладых людзей і моладзевых працаўнікоў, а таксама акрэсліць захады, якія **ўзмацняюць якасную рэалізацыю Youthpass**.

Мэта 3:

Узмацніць **бачнасць і прызнанне навучальнай каштоўнасці моладзевай працы**, улічваючы ўвесь спектр навучання, якое адбываецца праз моладзевыя праграмы (як маладыя людзі, так і моладзевыя працаўнікі лічацца навучэнцамі, яны падпадаюць пад усе аспекты прызнання і розныя фазы валідацыі).

Мэта 4:

Праз досвед, атрыманы з Youthpass, інфармаваць пра **адпаведныя палітычныя працэсы**, падтрымліваць **развіццё моладзевай палітыкі (палітыкі ў сферы занятасці) на еўрапейскім і дзяржаўным узроўнях, а таксама прыкладаць сістэмныя намаганні** для садзейнічання прызнанню і валідацыі навучання.

4 ТРОХІ ДЭТАЛЯЎ ПРА YOUTHPASS

Моладзевы пашпарт Youthpass - гэта еўрапейскі інструмент прызнання для выяўлення і дакументавання вынікаў навучання, набытых праз удзел у праектах праграмаў Erasmus+ і Еўрапейскага корпусу салідарнасці. Моладзевы пашпарт Youthpass спрыяе індывідуальнаму асэнсаванню і ўсведамленню важнасці навучанні і дапамагае зрабіць вынікі навучання бачнымі для саміх навучэнцаў, а таксама для іншых. Ён накіраваны на ўзмацненне практыкі рэфлексіі ў моладзевай працы і салідарнай дзейнасці, тым самым павышаючы іх якасць і прызнанне. Ён таксама падтрымлівае бесперапынныя траекторыі навучання маладых людзей і моладзевых працаўнікоў і павышае бачнасць каштоўнасці еўрапейскага ўзаемадзеяння.

Сертыфікаты Моладзевага пашпарту Youthpass, упершыню выпушчаныя ў 2007 годзе; да чэрвеня 2021 года яны выдаваліся больш за 1,1 мільёна разоў. З моманту свайго стварэння Youthpass быў даступны для ўдзельнікаў моладзевых праграмаў ЕС "Моладзь у дзеянні" і Erasmus+, а ў 2019 годзе быў пашыраны на нядаўна запушчаны Еўрапейскі корпус салідарнасці. Сертыфікат Youthpass убудаваны ў мэтаскіраваны працэс, які дапамагае звярнуць увагу на навучанне і ўсвядоміць сам працэс навучання і яго вынікі. Гэта добраахвотны інструмент, які даступны ўсім удзельнікам гэтых праграмаў, як маладым людзям, так і моладзевым працаўнікам.

Даследаванне ўздзеяння Youthpass 2013 года[13] паказала, што **асноўная каштоўнасць Моладзевага пашпарту Youthpass палягае ў павышэнні ўвагі да навучання ў падтрыманых праектах і ў павышэнні ўсведамлення асабістага працэсу навучання** і яго вынікаў. Маніторынгавае апытанне RAY удзельнікаў моладзевых праектаў Erasmus+ 2020 года[14] пацвердзіла, што рэфлексія пра навучанне і самаацэньванне ў кантэксце Моладзевага пашпарту Youthpass дапамагае ўдзельнікам лепш усвядоміць свае дасягненні. Згодна з апытаннем, большасць уладальнікаў Моладзевага пашпарту Youthpass, якія выкарыстоўвалі яго ў працэсе падачы заяўкі на працу, стажыроўку або працяг навучання, прызналі, што гэта ім дапамагло. Таму ў праектах, рэалізуецца рэфлексія і Моладзевы пашпарт Youthpass разглядаецца як каштоўны інструмент, які дапамагае павысіць якасць і ўздзеянне праектаў праз павышэнне абазнанасці ўдзельнікаў пра свае нядаўна набытыя кампетэнцыі і праз лепшае ўменне іх апісаць.

[13] Kloosterman, P., Taru, M., (2013) → Youthpass Impact Study. Young people's personal development and employability and the recognition of youth work.

[14] Böhler, J., et al, (2020). → Research Report. RAY-MON. Effect and outcomes of the Erasmus+ Youth in Action programme. Transnational Analysis.

5

РОЛЯ І ПРЫРОДА YOUTHPASS У 2027 ГОДЗЕ

Наступныя ключавыя словы апісваюць, як мы ўяўляем канцэпцыю Youthpass у 2027 годзе.

Цэласнасць:

Канцэпцыя Youthpass павінна працягваць укараняць тры шырокія элементы - інструмент распазнавання, працэс і стратэгічнае дзеянне - кожны з якіх падтрымлівае іншыя. Усе яны будуць умацоўвацца і развівацца далей.

Вызначэнне рамак:

Праца з Youthpass у якасці стратэгічных рамак будзе скіраванай на перспектыву і выразна звязанай з працэсам фармавання палітыкі, якая спрыяе развіццю еўрапейскай моладзевай працы. Ён будзе адыгрываць апорную ролю ў забеспячэнні сінергіі і злучэнні зацікаўленых бакоў і ініцыятываў, якія робяць свой унёсак у справу прызнання і валідацыі, а таксама ў нарошчванне патэнцыялу ў супольнасці практыкаў.

Канцэптуальна:

Youthpass будзе граць важную ролю ў вывучэнні, канцэптуалізацыі і асвятленні навучання ў моладзевай сферы ва ўсёй яе разнастайнасці. Праца вакол Youthpass будзе ўключаць прасоўванне дэбатаў і будаванне доказаў пра навучанне ў моладзевай працы. Акрамя нефармальнага навучання, канцэптуальная праца з Youthpass будзе ўключаць у сябе ўзмацненне ролі інфармальнага навучання і яго прызнанне ў моладзевай працы.

На аснове пацверджаных фактаў:

Механізмы маніторынгу і ацэнкі рэалізацыі Стратэгіі Youthpass і інструменту гарантуюць, што яны абодва адпавядаюць патрэбам мэтавых групаў і адаптуюцца да любых новых патрэбаў.

Мэтаскіраванасць:

Наколькі гэта магчыма, рашэнні ў рамках Youthpass будуць адказам на канкрэтныя патрэбы сваіх мэтавых групаў і кантэкстаў. Гэта будзе ўключаць у сябе разгляд магчымых патрабаванняў да інфармацыі і інструкцыяў, а таксама адпаведныя фарматы ў рамках моладзевых праграмаў. Неабходна таксама забяспечыць, каб Youthpass адпавядаў неабходнасці прызнання вялікай групы спецыялістаў-практыкаў у моладзевай працы.

Натхняльнасць:

Канцэпцыя, інструмент і прынцыпы Youthpass могуць служыць узорам і натхненнем для далейшага прызнання рознай практыкі ў моладзевай сферы. Гэта можа натхніць дыскусіі пра прызнанне і валідацыю нефармальнага і інфармальнага навучання ў моладзевай працы і валанцёрстве для распрацоўкі рамак прызнання/валідацыі на нацыянальным узроўні, а таксама для якасці практыкі працы з моладдзю і дакументацыі навучання, якой адбываецца ў яе межах.

З акцэнтам на супрацоўніцтва:

Рэалізацыя Youthpass і распрацоўка стратэгічных захадаў па прызнанні грунтуецца на ўдзеле і дыялогу з усімі адпаведнымі зацікаўленымі бакамі, з моцным акцэнтам на скразную міжсектарную пабудову моладзевай палітыкі ў Еўропе.

Стваральнасць:

Інфармацыя і камунікацыя забяспечаць шырокую абазнанасць і добрае разуменне ролі навучання ў моладзевай працы і каштоўнасці Youthpass. Канцэптуальнае, якаснае і колькаснае развіццё інструменту Youthpass, а таксама ўзмоцненае суправаджэнне прывядуць да збалансаванай рэалізацыі ва ўсіх розных відах дзейнасці і мэтавых групах інструменту, а таксама ў розных краінах.

6 СФЕРЫ ПРЫМЯНЕННЯ

Стратэгія моладзевага пашпарту Youthpass прапануе наступныя тры сферы прымянення. Яны апісваюць захады, неабходныя для дасягнення мэтаў і задач гэтай стратэгіі, адначасова дапамагаючы сфармаваць да 2027 года рысы і функцыі Моладзевага пашпарту Youthpass, апісаныя ў раздзеле вышэй.

1

Рэалізацыя і далейшае развіццё Моладзевага пашпарту Youthpass:
Замацаванне Моладзевага пашпарту Youthpass як еўрапейскага інструменту празрыстасці, які спрыяе выяўленню і дакументаванню нефармальных і інфармальных вынікаў навучання ў рамках Erasmus+ і Еўрапейскага корпусу салідарнасці.

2

Навучанне і прызнанне:
Развіццё патэнцыялу практыкі навучання і прызнання ў моладзевай сферы і праз арганізацыі па моладзевай працы. Гэта натхніць інавацыі для ўзмацнення ўздзеяння і якасці гэтай моладзевай працы.

3

Падтрымка палітыкі:
Інфармаваць і падтрымліваць распрацоўку і ўкараненне сістэм і палітыкі па прызнанні і валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання ў сферы моладзі, а таксама ствараць магчымасці для навучання ў асяроддзі аднагодкаў і абмену сістэматычнымі рашэннямі, якія павышаюць навучальную каштоўнасць моладзевай працы ў Еўропе.

Нататка пра ўзаемасувязь паміж трыма сферамі прымянення: **першая сфера**, «Укараненне і развіццё Моладзевага пашпарту Youthpass», складае аснову стратэгіі. **Другая** далей развівае Моладзевы пашпарт Youthpass як карысную мадэль умацавання навучання ў моладзевай сферы і мае на мэце прасоўванне яго якасці. Такім чынам, гэта разглядаецца як другі прыярытэт стратэгіі. **Трэцяя сфера**, якая мае на мэце інфармаванне і падтрымку сістэм і палітыкі, мае важнае значэнне для стварэння ўзаемавыгаднай сувязі паміж палітыкай і практыкай і лічыцца трэцім прыярытэтам. Усе тры сферы ўзаемадапаўняюць і ўмацоўваюць як іншыя полі, так і канкрэтныя захады ў іх рамках.

1

Сфера прымянення 1:

УКАРАНЕННЕ І ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ МОЛАДЗЕВАГА ПАШПАРТУ YOUTHPASS

Гэтая сфера прымянення спалучае ў сабе меры, неабходныя для рэалізацыі і развіцця Youthpass як еўрапейскага інструменту празрыстасці, а таксама для спрыяння прасцейшаму выяўленню і дакументацыі нефармальных і інфармальных вынікаў навучання ва ўсіх аспектах дзейнасці праграмаў Erasmus+ "Моладзь" і Еўрапейскага корпусу салідарнасці.

- Распрацоўка канцэпцыі і інструменту Youthpass, як апісана ніжэй у раздзеле "Далейшае развіццё Моладзевага пашпарту Youthpass як інструменту прызнання". Улічваючы неабходнасць рэагавання на бягучыя і новыя патрэбы розных суб'ектаў і мэтавых групаў у рамках супольнасці практыкаў моладзевай працы і еўрапейскіх праграмаў, гнуткасць з'яўляецца адным з ключавых паняццяў.

- Захады па камунікацыі і інфармаванні для лепшай абазнанасці пра навучанне і рэфлексію як аспект якасці ў моладзевай працы і ва ўсёй дзейнасці ў рамках праграмаў ЕС. Гэтыя захады будуць грунтавацца на стратэгічнай канцэпцыі па камунікацыі для Моладзевага пашпарту Youthpass і будуць уключаюць у сябе, сярод іншага, працу з супольнасцю практыкаў і папулярызацыю натхняльных прыкладаў. Яны таксама будуць накіраваныя на інфармаванне арганізацыяў пра перавагі валідацыі, калі гаворка ідзе пра іх заўважнасць і аддачу ад іх асноўнай дзейнасці.

- Адукацыйныя матэрыялы і распрацоўкі, якія дапамогуць бенефіцыярам растлумачыць удзельнікам, што такое Моладзевы пашпарт Youthpass і будуць суправаджаць іх на розных этапах праектаў. Гэта ўключае апісанне таго, што азначае якасны працэс Youthpass, а таксама прадстаўленне інфармацыі і падтрымкі бенефіцыярам, каб яны маглі рыхтаваць, праводзіць і кантраляваць рэфлексію і дакументаванне навучання. У дапаможных матэрыялах будуць разглядацца магчымыя разыходжанні ў патрэбах розных суправаджаючых асобаў у супольнасці моладзевай працы і практыкі, напрыклад, моладзевых працаўнікоў, трэнераў, настаўнікаў, коўчаў і г.д.

- У той час як моладзевыя працаўнікі і іх кампетэнцыі па спрыянні навучанню з'яўляюцца ключавымі для якасці любога праекту, неабходна развіваць інфармацыю непасрэдна звернутую да моладзі, асабліва з мэтай падтрымкі прызнання і валідацыі ў дзеяннях, дзе ўдзельнікі не маюць непасрэднай падтрымкі моладзевых працаўнікоў. Такая мэтавая інфармацыя дапаможа маладым людзям актыўна апісваць уласныя вынікі навучання і тым самым павялічваць для сябе адукацыйную каштоўнасць моладзевага пашпарту Youthpass. Гэтая інструкцыя таксама можа дапамагчы маладым людзям у рэфлексіі для пазнейшых адукацыйных або кар'ерных сцяжынах.

- Распрацоўка стратэгіяў і інструментаў для лепшага прызнання і валідацыі навучання моладзевых працаўнікоў, трэнераў і іншых спецыялістаў-практыкаў моладзевай працы ў моладзевых праграмах. Каб задаволіць патрэбы шырокай мэтавай групы моладзевых працаўнікоў у дачыненні да прызнання іх кампетэнцыяў, у канцэпцыю Youthpass, магчыма, спатрэбіцца ўлучыць іншыя або дадатковыя элементы, якія выходзяць за рамкі навучальнай дзейнасці, фінансаванай у рамках дзвюх еўрапейскіх моладзевых праграмаў.

- Распрацоўка і рэалізацыя мэтавых захадаў па прафесійным навучанні, заснаваных на стратэгічным падыходзе да навучання для Моладзевага пашпарту Youthpass. Пры распрацоўцы захадаў па прафесійным навучанні неабходна пераканацца, што яны сумяшчальныя з Еўрапейскай стратэгіяй навучання і, у прыватнасці, з мадэлямі кампетэнцыяў для моладзевых працаўнікоў і трэнераў. Таксама павінна быць падтрымка рэалізацыі працэсу Моладзевага пашпарту Youthpass у іншых навучальных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў рамках сеткі нацыянальных агенцтваў. Каб падтрымаць якасць рэалізацыі Моладзевага пашпарту Youthpass у такіх захадах па прафесійным навучанні на нацыянальным і еўрапейскім узроўні, неабходна арыентавацца на супольнасць трэнераў.

- Супрацоўніцтва з сеткай Нацыянальных агенцтваў і рэсурсных цэнтраў SALTO праграмаў Erasmus+ "Моладзь" і Еўрапейскі корпус салідарнасці. Рэалізацыя Моладзевага пашпарту Youthpass як аспекту якасці праекту моцна залежыць ад дасведчанасці і падтрымкі з боку сеткі нацыянальных агенцтваў. Некаторыя калегі ў нацыянальных агенцтвах ужо атрымалі пэўную ролю ў рэалізацыі Моладзевага пашпарту Youthpass і спрыянні прызнанню ў сваіх краінах (гл. пункт пра спецыялістаў-практыкаў Youthpass у раздзеле "Кіраванне"). Аднак неабходна правесці далейшую працу па павышэнні інфармаванасці пра навучальную каштоўнасць моладзевых праектаў для ўсёй сеткі нацыянальных агенцтваў і атрымаць іх актыўную падтрымку ў спрыянні прызнанню і валідацыі навучання праз Моладзевы пашпарт Youthpass як скразнога паказніка якасці. Гэта патрабуе ўзмоцненага кантакту з калегамі з нацыянальных агенцтваў і падтрымкі з боку Рэсурсных цэнтраў прафесійнай Трэнінгаў і супрацоўніцтва SALTO. Неабходная падтрымка будзе ў форме інфармацыі, рэкамендацыяў, матэрыялаў, якія Нацыянальныя агенцтвы могуць карэктаваць і распаўсюджваць па меры неабходнасці, рэгулярных магчымасцей для абмену і навучання, падтрымкі вырашэння пытанняў па навучанні і Youthpass з мультыплікатарамі і іншымі сеткамі Нацыянальных агенцтваў, а таксама ўключэння ў кансультатыўныя і сумесныя творчыя працэсы.

2

Сфера прымянення 2:

НАВУЧАННЕ І ПРЫЗНАННЕ

Гэтая сфера прымянення накіраваная на пашырэнне інфармаванасці і прызнанне навучальнай каштоўнасці моладзевай працы, у прыватнасці за кошт нарошчвання патэнцыялу арганізацыяў, які займаюцца моладзевай працай. Маштаб прапанаваных захадаў выходзіць за рамкі еўрапейскіх моладзевых праграмаў, каб забяспечыць пошук сінергіі ў рамках супольнасці па моладзевай працы і валанцёрстве.

- Захады па вывучэнні і тлумачэнні працэсу навучання, развіцця кампетэнцыяў і іх прызнання ў моладзевай працы ў Еўропе, з асаблівым акцэнтам на інфармальнае навучанне, а таксама на нефармальнае навучанне. Гэта азначае збор фактаў, пашырэнне абмеркаванняў, падтрымку навучання ў асяроддзе аднагодкаў і павышэнне агульнай абазнанасці пра навучальную каштоўнасць моладзевай працы.

- Павелічэнне абазнанасці і нарошчванне патэнцыялу як спецыялістаў-практыкаў моладзевай працы ў якасці фасілітатараў навучання, так і арганізацыяў адносна навучальнай каштоўнасці моладзевай працы. Для гэтага ў якасці мадэлі можа служыць працэс моладзевага пашпарту Youthpass. Гэтыя захады ўключаюць магчымасць вывучэння і абмеркавання прыдатнасці метадалогіі па тыпу працэсу Моладзевага пашпарту Youthpass у практыцы моладзевай працы; навучальныя і інфармацыйныя матэрыялы; і іншыя магчымыя спецыяльныя інструменты.

- Падтрымка і спрыянне супрацоўніцтву і сінергіі паміж працэсамі і ініцыятывамі ў супольнасці практыкаў моладзевай працы, якія адносяцца да розных аспектаў і этапаў прызнання і валідацыі, у прыватнасці да стратэгічных ініцыятываў, якія фінансуюцца праграмай Erasmus+. Такое супрацоўніцтва можа адкрыць магчымасці для павышэння якасці праз навучанне на прыкладзе іншых і праз каардынацыю дзеянняў у супрацоўніцтве з Еўрапейскай камісіяй, каб працэсы і практыкі, запушчаныя ў моладзевай сферы, атрымалі лепшую бачнасць і ўплыў, а таксама зрабілі свой унёсак у адпаведныя палітычныя працэсы. Першапачатковыя захады па павелічэнні абазнанасці пра такія ініцыятыва і абмеркаванні іх выклікаў могуць даць прастору для падтрымкі і супрацоўніцтва, напрыклад, у выглядзе тэматычнага абмену.

- Прызнанне, якасць і інавацыі – гэта прыярытэтныя тэмы ў парадку дня для развіцця моладзевай працы ў Еўропе. У Еўропе ўжо існуе мноства практыкаў, дзе імкнуцца забяспечыць прызнанне і валідацыю навучання ў моладзевай сферы. Праца ў рамках Моладзевага пашпарту Youthpass можа пашыраць і натхняць якасныя падыходы, працэсы і інструменты, якія служаць адной і той жа мэце – павышэнню абазнанасці пра навучанне праз моладзевую працу і яго значэнне. Адпаведныя захады, напрыклад маркіроўку, варта вывучыць з мэтай пашырэння заўважнасці і даверу да такіх падыходаў прызнання якасці, а таксама для забеспячэння падтрымкі якасці гэтых падыходаў.

3

Сфера прымянення 3:

ПАДТРЫМКА ПАЛІТЫКІ

Мэтай дадзенай сферы прымянення з'яўляецца спрыянне развіццю і рэалізацыі палітыкі ў галінах, якія тычацца навучальнай каштоўнасці моладзевай працы, прызнання і валідацыі, а таксама пашырэнне ролі моладзевай працы і, у прыватнасці, Моладзевага пашпарту Youthpass у такой палітыцы. Дадзеная сфера патрабуе актыўнага супрацоўніцтва паміж зацікаўленымі бакамі з іншых адпаведных сектараў, у прыватнасці з тымі, хто займаецца валідацыяй нефармальнага і інфармальнага навучання.

- Урокі, атрыманыя ў працэсе рэалізацыі Моладзевага пашпарту Youthpass і валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання ў рамках дзвюх моладзевых праграмаў ЕС, у прыватнасці, факты наяўнасці навучання ў праектах і вынікі прызнання і валідацыі ў гэтых кантэкстах, павінны распаўсюджвацца па адпаведных каналах і прадстаўляцца ў фармаце, які можа інфармаваць развіццё палітыкі і практыкі на розных узроўнях. Могуць быць распрацаваныя ўзорныя рашэнні і рэкамендацыі па працэдурах валідацыі ў моладзевай сферы.

- Неабходна забяспечыць сінергію ў рэалізацыі Моладзевай стратэгіі ЕС і Еўрапейскага парадку дня працы з моладдзю. Планавальнікі будучых нацыянальных мерапрыемстваў (FNAPs), звязаныя з Моладзевай стратэгіяй ЕС, прапануюць ідэі сістэмнага развіцця і прыярытэтаў на нацыянальным узроўні і стануць важнай асновай для вызначэння крокаў па сінергіі і нарошчванні патэнцыялу супрацоўніцтва. Сінергія і ўзаемадапаўняльнасць павінны забяспечвацца і з іншымі стратэгіямі, распрацаванымі ў кантэксце моладзевых праграмаў ЕС – Еўрапейскай стратэгіяй прафесійнай падрыхтоўку, Стратэгіяй інклюзіўнасці і разнастайнасці і Стратэгіяй удзелу моладзі.

- Праца па далейшым развіцці Моладзевага пашпарту Youthpass і падтрымка, аказаная Нацыянальным агенцтвам, могуць узмацніць унёсак моладзі ў адпаведныя палітычныя дыскусіі і сістэмныя распрацоўкі. Яны могуць натхніць, развіць і падтрымаць рэалізацыю палітычных рашэнняў і вынікаў узаемапераплеценай навучальнай дзейнасці на нацыянальным і еўрапейскім узроўнях.

- Унёсак супольнасці практыкаў ў палітычныя працэсы, звязаныя з прызнаннем і валідацыяй, павінен быць узмоцнены дзякуючы скаардынаванасці ў падыходзе. Дзякуючы рэгулярнаму супрацоўніцтву і абмену, а таксама супрацоўніцтву з сферай валанцёрства і іншымі сумежнымі сферамі, арганізацыі і суб'екты моладзевай працы могуць рабіць сваю працу больш заўважнай, больш эфектыўна тлумачыць яе характар, а таксама быць мець больш аднародны падыход у камунікаванні з уладамі і іншымі зацікаўленымі бакамі.

- Камунікацыя пра Моладзевы пашпарт Youthpass таксама прадугледжвае інфармаванне шырокай супольнасці моладзевай працы пра найноўшыя змены ў еўрапейскай палітыцы, звязанай з прызнаннем і валідацыяй, а таксама падтрымку інфармаванага прымянення і далейшай рэалізацыі палітыкі. Яна таксама ўключае збор і прадстаўленне інфармацыі адносна стану прызнання і валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання ў моладзевай працы палітыкам, якія займаюцца моладзевай сферай, а таксама іншым зацікаўленым бакам.

7 ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ YOUTHPASS ЯК ІНСТРУМЕНТУ ПРЫЗНАННЯ

Для таго, каб Youthpass быў інструментам прызнання для падтрымкі вышэйзгаданых мэтаў і задач стратэгіі, яму трэба ўзмацніць сваю асноўную каштоўнасць і развівацца далей як канцэптуальна, так і тэхнічна. Моладзевы пашпарт Youthpass павінен захаваць сваю ролю ў якасці еўрапейскага інструменту прызнання, які падкрэслівае і ўзмацняе навучальную каштоўнасць дзейнасці, што рэалізуецца ў рамках дзвюх моладзевых праграмаў ЕС, заахвочваючы пры гэтым працэс свядомай рэфлексіі. Трэба, каб моладзевы пашпарт Youthpass стаў даступным для падтрымкі ўсіх падобнай дзейнасці і каб ён разглядаўся ў рамках гэтых праграмаў як прыкмета якасці.

Да 2027 года Моладзевы пашпарт Youthpass як інструмент прызнання павінен адлюстроўваць наступныя характарыстыкі:

- У цэнтры ўвагі абноўленага Моладзевага пашпарту Youthpass будзе адлюстраванне, выяўленне і дакументаванне навучання, якое адбываецца ва ўсіх фарматах і дзеяннях, якія падтрымліваюцца абедзвюма праграмамі. Матывацыяй для выкарыстання Моладзевага пашпарту Youthpass павінна стаць жаданне дапамагчы ўдзельнікам **лепш усвядоміць працэс свайго навучання, умацаваць, ідэнтыфікаваць і дакументаваць яго**, і тым самым палепшыць якасць праектаў.

- Усе ўдзельнікі Erasmus+ "Моладзь" і Еўрапейскага корпусу салідарнасці і іх праграм-пераемніц па-ранейшаму будуць **мець права** праходзіць працэс Youthpass і атрымліваць дакументаваныя пацвярджэнні вынікаў навучання. Моладзевы пашпарт Youthpass застаецца добраахвотным для карыстальнікаў у адпаведнасці з характарыстыкамі нефармальнага і інфармальнага навучання. Моладзевы пашпарт Youthpass таксама будзе лепш адлюстроўваць характар нефармальнага і інфармальнага навучання, **ставячы патрэбы навучэнца ў цэнтры ўвагі**, напрыклад, дазваляючы навучэнцам сумесна ствараць свае індывідуальныя профілі Youthpass. Хоць працэс павінен заставацца простым для выкарыстання маладымі людзьмі, будучыя ўліковыя запісы ўдзельнікаў дадуць маладым людзям больш магчымасцяў кіравання працэсам рэфлексіі і апісання вынікаў навучання з розных праектаў, у якіх яны былі задзейнічаныя.

- **Цэнтральным элементам і адпраўной кропкай** рэалізацыі Моладзевага пашпарту Youthpass будзе – больш, чым раней – **працэс рэфлексіі**, які спрыяе ўсведамленню вынікаў навучання, атрыманых на розных этапах удзелу ў праектах. Моладзевы пашпарт Youthpass будзе прапаноўваць лічбавы інструмент рэфлексіі, а таксама іншыя інструменты падтрымкі ў адпаведнасці са спецыфікай праектаў і патрэбамі мэтавых групаў.

- Абноўлены Моладзевы пашпарт Youthpass будзе лепш **падтрымліваць увесь працэс навучання, звязаны са згаданымі праектам**, у тым ліку падрыхтоўку і крокі ў працяг, а таксама – дзе гэта дарэчы – розныя дзеянні ў рамках аднаго праекта. **Налады Youthpass будуць гнуткімі і дастасаванымі да разнастайных праектаў** і відаў дзейнасці, якія падтрымліваюцца моладзевымі праграмамі.

- Закладзеныя функцыі будучага інструменту Youthpass дазволяць рабіць кароткае **апісанне кампетэнцыяў**, атрыманых дзякуючы ўдзелу ў навучальных дзеяннях, фінансаваных праз абедзве моладзевымі праграмамі. Яно будзе назапашвацца і адлюстроўвацца ў анлайн-профілях удзельнікаў. Чакаецца, што гэта дазволіць ім падключыць свае апісанні кампетэнцыяў да іншых платформаў, напрыклад, Europass або іншых прафесійных платформаў/інструментаў, якія павялічаць перавагі ад Моладзевага пашпарту Youthpass для далейшых адукацыйных або прафесійных сцяжынаў яго ўладальнікаў.

- Таксама будуць уважліва разгледжаныя **патрэбы моладзевых працаўнікоў і трэнераў у якасці навучэнцаў і ўладальнікаў** у кантэксце абедзвюх праграмаў і па-за іх кантэкстам. Моладзевы пашпарт Youthpass прапануе адпаведны інструмент прызнання для гэтай мэтавай групы, з адпаведнай рамкай кампетэнцыяў і, магчыма, з дастасаваным брэндам, які будзе лепш адлюстроўваць прафесійны характар развіцця моладзевых працаўнікоў.

- Апісанні вынікаў навучання ў сістэме Youthpass па-ранейшаму будуць сугучныя з **еўрапейскімі рамкамі ключавых кампетэнцыяў навучання цягам усяго жыцця**. Будуць распрацаваныя рашэнні, якія забяспечаць лепшую падтрымку адлюстравання і дакументацыі набытых кампетэнцыяў, асабліва для тых, якія найбольш часта распрацоўваюцца ў кантэксце моладзевай працы і валанцёрства. Распрацоўка такіх рашэнняў будзе натхняцца існуючымі (больш падрабязнымі) рамкамі кампетэнцыяў, такімі як LifEComp. Для апісання развіцця кампетэнцыяў моладзевых працаўнікоў падыходзяць **мадэлі кампетэнцыяў**, распрацаваныя ў рамках Еўрапейскай стратэгіі прафесійнай падрыхтоўкі.

- Моладзевы пашпарт Youthpass стане **сучасным інструментам прызнання**, які базуецца на найноўшых тэхналагічных распрацоўках. Гэта ўдасканаліць **зручнасць і прывабнасць** для карыстальніка і дазволіць узаемадзейнічаць з іншымі сістэмамі, у прыватнасці, з Еўрапейскай камісіяй, калі гэта будзе неабходна.

- Новыя распрацоўкі ў Youthpass надаюць асаблівую ўвагу **падтрымцы маладых людзей з меншымі магчымасцямі**, каб яны маглі ў поўнай ступені скарыстацца нефармальным і інфармальным навучаннем для свайго асабістага развіцця і будучай сцяжыны росту. Усе будучыя распрацоўкі ў рамках Youthpass будуць садзейнічаць большай **даступнасці і інклюзіўнасці** нструменту і працэсу(аў) Моладзевага пашпарту Youthpass. Сюды ўваходзіць паляпшэнне даступнасці вэб-інструментаў і інтэрнэт-выданняў для людзей з асаблівымі патрэбамі і/або інваліднасцю. Будзе прыкладацца вялікая намаганні, каб зрабіць інструмент і працэс простым у выкарыстанні для ўсіх мэтавых групаў Моладзевага пашпарту Youthpass.

- Ён будзе працягваць заставацца **шматмоўным** інструментам, забяспечваючы якасныя пераклады анлайн-інструменту, сертыфікатаў і іншых дапаможных матэрыялаў.

- Ён таксама будзе **падтрымліваць дзейнасць у сферы анлайн-навучання** ў рамках моладзевых праграмаў, у тым ліку ў якасці самастойных інструментаў навучання. Пройдуць кансультацыі з супольнасцю практыкаў пра неабходнасць магчымага спецыяльнага фармату інструменту прызнання.

8 МЭТАВЫЯ ГРУПЫ СТРАТЭГІІ

У прыведзенай ніжэй табліцы прадстаўлены агляд мэтавых групаў Стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass з улікам асноўных запланаваных захадаў.

Маладыя людзі

- Мэтавая група інструменту Youthpass
- Інфармацыя і падтрымка праз моладзевых працаўнікоў
- Таксама зразумелая, прывабная і матывацыйная інфармацыя праз сайт Youthpass і іншыя інструменты

Моладзевыя працаўнікі

- Мэтавая група інструменту Youthpass: патрэба ў адмысловых наладах
- Інфармацыя пра прыроду і каштоўнасць навучання ў моладзевых праектах і патэнцыял Моладзевага пашпарту Youthpass у гэтай сферы
- Інфармацыйныя, навучальныя і суправаджальныя матэрыялы пра тое, як падтрымліваць навучанне ў сферы працы з моладдзю
- Інфармацыя пра адпаведныя працэсы фармавання палітыкі на еўрапейскім узроўні
- Інструменты, якія дапамогуць патлумачыць удзельнікам, што такое Моладзевы пашпарт Youthpass

Трэнеры і мультыплікатары

- Мэтавая група інструменту Youthpass: патрэба ў адмысловых наладах
- Інфармацыя і адукацыйная падтрымка для вырашэння праблемы прыроды і каштоўнасці навучання ў моладзевых праектах і патэнцыялу Моладзевага пашпарту Youthpass у гэтай сферы
- Падтрымка інтэграцыі працэсу Youthpass у рамках розных навучальных і інфармацыйных мерапрыемстваў
- Інфармацыя пра адпаведныя працэсы фармавання палітыкі на еўрапейскім узроўні
- Інструменты, якія дапамогуць патлумачыць удзельнікам, што такое Моладзевы пашпарт Youthpass

Арганізацыі па працы з моладдзю

- Натхненне, інфармацыя і нарошчванне патэнцыялу для ўмацавання навучальнай каштоўнасці іх працы
- Рашэнні, якія забяспечваюць заўважнасць і прызнанне іх падыходу да прызнання навучання ў моладзевай працы (напрыклад, маркіроўка)
- Інфармацыя пра адпаведныя працэсы фармавання палітыкі на еўрапейскім узроўні

Нацыянальныя агенцтвы і Рэсурсныя цэнтры SALTO

- Спрыянне абазнанасці пра навучальную каштоўнасць праектаў для моладзі і ў падтрымку салідарнасці сярод усіх супрацоўнікаў Нацыянальных агенцтваў
- Інфармацыйныя матэрыялы, дапаможнікі, матэрыялы па візуалізацыі, якія можна адаптаваць да нацыянальных кантэкстаў
- Падтрымка распрацоўкі і рэалізацыі адукацыйных захадаў (прафесійная падрыхтоўка і інш.) на аснове патрэбаў, абумоўленых кантэкстам
- Падтрымка і стымуляванне руху наперад у справе прызнання/валідацыі на нацыянальным узроўні
- Інфармацыя пра адпаведныя працэсы фармавання палітыкі на еўрапейскім узроўні

Улады, у т.л. Еўрапейская камісія

- Інфармацыя досвед і вынікі моладзевых праграмаў ЕС датычна навучання, прызнання і Моладзевага пашпарту Youthpass
- Уклад у абмеркаванні па працэдуры і практыцы прызнання і валідацыі

9 ІНСТРУМЕНТЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ СТРАТЭГІІ

Асноўным інструментам рэалізацыі стратэгіі з'яўляецца шматмоўны **сайт Youthpass і тэхнічны інструмент**, які складаецца з асяроддзя карыстальніка і базы дадзеных Youthpass для дакументавання навучання і выдачы сертыфікатаў. Сайт Youthpass таксама з'яўляецца асноўнай крыніцай дапаможных і навучальных матэрыялаў, а таксама каналам для навін, звязаных з Youthpass, і іншай інфармацыі.

Дадатковыя інструменты, прадугледжаныя для рэалізацыі стратэгіі, ўключаюць:

1

Для інфармацыі і візуальнай заўважнасці

- Стратэгія камунікацыі Еўрапейскай камісіі па моладзевых праграмах, у тым ліку ключавыя праграмныя дакументы, такія як Праграмныя гіды? па дзвюх моладзевых праграмах;
- Моладзевы партал ЕС як партал для моладзі пра моладзевыя праграмы і інфармацыйны канал;
- Канцэпцыя камунікацыі для Моладзевага пашпарту Youthpass, якая апісвае неабходныя захады і каналы камунікацыі, у тым ліку сацыяльныя сеткі.
- Публікацыі пра Youthpass і пра навучанне і прызнанне/валідацыю ў моладзевай працы (у тым ліку даведнікі, улёткі, эсэ, матэрыялы даследаванняў і г.д.);
- Рэгулярныя інфармацыйныя бюлетэні;
- Бюлетэнь і вэб-сайт сеткі SALTO-YOUTH;
- Навіны і інфармацыйныя каналы, звязаныя з праграмамі Erasmus+ "Моладзь" і Еўрапейскі корпус салідарнасці, на еўрапейскім, рэгіянальным і нацыянальным узроўні, у прыватнасці інфармацыйныя каналы нацыянальных агенцтваў
- Іншыя еўрапейскія мерапрыемствы і платформы зацікаўленых бакоў, звязаныя з моладдзю, нефармальным і інфармальным навучаннем, прызнаннем і валідацыяй.

2

Для адукацыйнай дзейнасці і супрацоўніцтва

Рамкі Нацыянальных агенцтваў моладзевых праграмаў ЕС TCA/NET граюць важную ролю ў рэалізацыі наступнай дзейнасці:

- Афлайн, змешаныя і анлайн прафесійныя трэнінгі і навучальныя мерапрыемствы для бенефіцыяраў, мультыплікатараў і партнёраў;
- Серыя мерапрыемстваў (семінараў, майстар-класаў, працоўных груп або іншых фарматаў), якія дазваляюць ажыццяўляць абмен, навучанне і супрацоўніцтва ў рамках супольнасці практыкаў – вызначаецца сумесна з гэтай супольнасцю;
- Дзейнасць (канферэнцыі і г.д.), якая падтрымлівае ўзаемнае навучанне і развіццё працэсаў на нацыянальным узроўні;
- Афлайн і анлайн-сустрэчы з калегамі з Нацыянальных агенцтваў для аказання рэгулярнай і спецыялізаванай падтрымкі;
- Супрацоўніцтва паміж Нацыянальнымі агенцтвамі і мультыплікатарамі і трэнерамі на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях;
- Супрацоўніцтва ў рамках сеткі SALTO-YOUTH.

3

Для нарошчвання ведаў

- Канцэпцыя маніторынгу Моладзевага пашпарту Youthpass і яго захадаў у яго рамках, у тым ліку штогадовы агляд новых тэндэнцыяў Youthpass;
- База дадзеных Моладзевага пашпарту Youthpass (на youthpass.eu).
- Даследчыя інструменты распрацаваныя ў супрацоўніцтве з рамкай RAY і іншымі даследчымі партнёрамі.

10 РЭАЛІЗАТАРЫ

З улікам таго, што Youthpass замацаваны за моладзевымі праграмамі ЕС, цэнтральнымі каардынатарамі і стэйкхолдэрамі гэтай стратэгіі **яўляюцца Еўрапейская камісія і Рэсурсны цэнтр** Трэнінгаў **і Супрацоўніцтва SALTO**, тасноўныя выканаўцы стратэгіі на еўрапейскім узроўні. У адпаведнасці з мандатамі тэматычных рэсурсных цэнтраў SALTO-YOUTH, прынятых у 2019 годзе, рэсурсныя цэнтры адказваюць за павышэнне якасці і ўплыву праектаў Erasmus+ у сферы моладзі. Пры гэтым яны выступаюць у якасці асяродкаў ведаў і досведу, якія лучаць вынікі моладзевых праграмаў ЕС з адпаведным развіццём палітыкі.

Партнёры па супрацоўніцтве ўключаюць **Нацыянальныя агенцтвы і рэсурсныя цэнтры SALTO-YOUTH**, якія рэалізуюць моладзевыя праграмы ЕС. Ім прапануецца выкарыстоўваць усе захады стратэгіі, выкладзеныя ў трох сферах прымянення, для рэкамендацыяў і ідэяў адносна стратэгічных дзеянняў на нацыянальным/ рэгіянальным узроўні. У прыватнасці, ім прапануецца планаваць меры па павышэнні візуальнай прадстаўленасці і прызнання каштоўнасці навучання моладзевай працы і моладзевых праграмаў, а таксама схемы Моладзевага пашпарту Youthpass для дакументавання і адлюстравання гэтай

каштоўнасці на індывідуальным узроўні. Яны спрыяюць далейшаму развіццю Моладзевага пашпарту Youthpass дзякуючы ведам і высновам, атрыманым падчас рэалізацыі на нацыянальным узроўні. Акрамя таго, тое, як Нацыянальныя агенцтвы і сетка SALTO рэалізуюць Моладзевы пашпарт Youthpass у сваёй дзейнасці і як яны гэта тлумачаць, аказвае моцны ўплыў на тое, як Youthpass успрымаецца бенефіцыярамі і іншымі зацікаўленымі бакамі. Для забеспячэння шматмоўнасці сертыфікатаў Youthpass і іншых матэрыялаў неабходная падтрымка з боку ацыянальных агенцтваў і, патэнцыйна, рэгіянальных рэсурсных цэнтраў SALTO. Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO імкнецца аказваць пастаянную падтрымку сетцы Нацыянальных агенцтваў у іх працы па прызнанні і валідацыі праз адпаведныя матэрыялы, дзейнасць па супрацоўніцтве і іншую падтрымку нацыянальных працэсаў, дзе гэта неабходна і магчыма.

Акрамя таго, рэсурсныя цэнтры SALTO-YOUTH працуюць з іншымі праграмнымі стратэгіямі, у прыватнасці Еўрапейскай стратэгіяй навучання, Стратэгіяй інклюзіўнасці і разнастайнасці і Стратэгіяй удзелу моладзі. Яны звязаныя з дадзеным дакументам тым, што дзякуючы іх досведу і спецыялізацыі паляпшаецца якасць моладзевых праграмаў. Сінергія павінна павялічвацца дзякуючы гэтым стратэгія, а таксама іншым ролям, у якіх выступаюць рэсурсныя цэнтры SALTO-YOUTH, каб забяспечыць прыдатнасць розных аспектаў канцэпцыі Моладзевага пашпарту Youthpass для канкрэтных мэтавых групаў SALTO.

Інфармаванне і перакананне моладзевых **працаўнікоў, трэнераў і іншых мультыплікатараў**, якія, у прыватнасці, працуюць у кантэксце моладзевых праграмаў ЕС, мае вырашальнае значэнне для практычнай і якаснай рэалізацыі Моладзевага пашпарту Youthpass, што, у сваю чаргу, гарантуе найбольшае ўздзеянні на іх удзельнікаў. Важна, каб у сваёй дзейнасці яны перадавалі актуальнасць і важнасць рэфлексіі і дакументацыі навучання ўдзельнікам і падтрымлівалі іх у гэтым працэсе незалежна ад характару дзейнасці.

З мэтай забеспячэння сувязі з іншымі структурамі і наладжвання палітыкі і практыкі, некаторыя захады, апісаныя ў стратэгіі, патрабуюць супрацоўніцтва з **іншымі зацікаўленымі бакамі**, такімі як арганізацыі, якія працуюць у сферы моладзі - супольнасць практыкаў, мясцовыя/рэгіянальныя/нацыянальныя ўлады і еўрапейскія працоўныя групы, платформы і ўстановы. У гэтую групу таксама ўваходзяць даследчыкі і зацікаўленыя бакі з іншых сектараў, такіх як адукацыя або занятасць, якія цікавяцца тэмамі, звязанымі з прызнаннем і валідацыяй навучання ў нефармальных і інфармальных кантэкстах.

11 КІРАВАННЕ

Стратэгія Youthpass накіроўвае працу Рэсурснага цэнтру Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO, які адказвае за рэалізацыю Youthpass у цесным супрацоўніцтве з Еўрапейскай камісіяй і пры падтрымцы іншых зацікаўленых бакоў.

Што тычыцца Стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass, Еўрапейская камісія мае падвойную місію. Пры рэалізацыі праграм ЕС, такіх як праграма Erasmus+ і Еўрапейскі корпус салідарнасці, Камісія імкнецца забяспечыць, каб асноўныя суб'екты мелі неабходныя інструменты для якаснай рэалізацыі. Камісія таксама адыгрывае

ключавую ролю ў рэалізацыі рамак супрацоўніцтва ў галіне палітыкі, такіх як Моладзевая стратэгія ЕС, якая падкрэслівае неабходнасць прызнання нефармальных і інфармальных вынікаў навучання праз моладзевую працу, дзе можа быць унёсак Стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass.

Найважнейшым органам кіравання, калі гаворка ідзе пра стратэгію, з'яўляецца Кансультацыйная група Моладзевага пашпарту Youthpass, якая складаецца з інстытуцыйных і незалежных экспертаў. Чакаецца, што яны будуць сачыць за рэалізацыяй Стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass і трохгадовых планаў дзеянняў і, пры неабходнасці, рабіць унёсак у справу Youthpass з улікам сваёй адметнасці. Склад Кансультацыйнай групы Youthpass рэгулярна пераглядаецца.

Што тычыцца спецыялістаў па моладзевым пашпарце Youthpass у Нацыянальных агенцтвах, прадугледжана, што яны будуць супрацоўнічаць на гарызантальным узроўні з іншымі калегамі, якія распаўсюджваюць інфармацыю, звязаную з Youthpass, ад і для зацікаўленых бакоў у сваіх краінах, дапамагаюць арганізаваць пераклады адпаведных матэрыялаў Youthpass, а таксама стратэгічна падтрымліваюць рэалізацыю Стратэгіі Youthpass на нацыянальным і, дзе гэта неабходна, еўрапейскім узроўнях. Планы дзеянняў па рэалізацыі стратэгіі сумесна ствараюцца Нацыянальнымі агенцтвамі і Рэсурсным цэнтрам Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO. Для выканання гэтых задач спецыялісты па Youthpass павінны мець дастатковую колькасць часу. Іх праца будзе арганізаванай праз рэгулярныя сустрэчы анлайн і афлайн з Рэсурсным цэнтрам Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO і Еўрапейскай камісіяй.

Згодна з мандатам SALTO, рэалізацыю стратэгіі будуць падтрымліваць рэгулярныя пасяджэнні рэсурсных цэнтраў SALTO-YOUTH і Еўрапейскай камісіі.

Часовыя рамкі: Стратэгія Моладзевага пашпарту Youthpass скіроўвае працу па тэме Youthpass у асноўным у рэчышча праграмаў Erasmus+ і Еўрапейскага корпусу салідарнасці падчас рэалізацыі цяперашняй Моладзевай стратэгіі ЕС, якая будзе доўжыцца да канца 2027 года. Праца па ажыццяўленні стратэгіі будзе арганізаваная паводле трохгадовых планаў дзеянняў, якія вызначаюць больш шырокія мэты і працэсы на адпаведныя перыяды, а таксама кароткіх гадавых планаў, якія вызначаюць больш канкрэтныя захады.

Стратэгія будзе пераглядацца падчас апошняга трохгадовага плану дзеянняў на падставе дадзеных маніторынгу і вынікаў даследаванняў, апісаных ніжэй.

12 МАНІТОРЫНГ, АЦЭНКА І ДАСЛЕДАВАННЕ

1

ІНДЫКАТАРЫ ДЛЯ МАНІТОРЫНГУ СТРАТЭГІІ

Для маніторынгу распрацоўкі і рэалізацыі інструменту і стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass прапануюцца наступныя агульныя індыкатары:

- Тэхнічнае і канцэптуальнае **развіццё інструменту Youthpass** , як гэта акрэслена ў дадзенай стратэгіі. Гэты паказчык будзе ўключаць вынікі апытанняў або іншыя меры ацэнкі для вывучэння ўздзеяння зробленых крокаў;
- **Рэалізацыя іншых ініцыятываў і працэсаў**, як гэта апісана ў стратэгіі, напрыклад, адукацыйных захадаў або крокаў па абмеркаванні прызнання з боку Рэсурснага цэнтрам Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO і іншымі зацікаўленымі бакамі стратэгіі.
- **Выкарыстанне Моладзевага пашпарту Youthpass:** у цэлым, а таксама ў рамках розных відаў дзейнасці, якія падтрымліваюцца праграмамі Erasmus+ “Моладзь” і Еўрапейскім корпусам салідарнасці. Мэта - дасягнуць шырэйшага і больш збалансаванага выкарыстання Моладзевага пашпарту Youthpass ва ўсіх відах дзейнасці. Статыстыка па Youthpass будзе весціся ў адпаведнасці з канцэпцыяй маніторынгу Youthpass, прынятай у 2018 годзе.
- **Выкарыстанне Моладзевага пашпарту Youthpass у розных краінах, ахопленых праграмай**. Мэта - дасягнуць шырэйшага і больш збалансаванага выкарыстання Youthpass у розных краінах.
- **Інфармацыйная дзейнасць і камунікацыя па тэме Моладзевага пашпарту Youthpass** праз навіны, звязаныя з Youthpass, і іх распаўсюд праз інфармацыйны бюлетэнь SALTO; павелічэнне інфармацыйнага ахопу праз вэб-сайт Youthpass; павелічэнне інфармацыйнага ахопу праз каналы сацыяльных медыя SALTO.
- **Ахоп анлайнавых дзеянняў:** удзел у анлайн-навучанні, спампоўка інтэрнэт-публікацыяў.
- **Даступнасць сертыфікатаў Youthpass на розных еўрапейскіх мовах**, а таксама перакладзеных версіяў іншых дапаможных матэрыялаў.

2

АЦЭНЬВАННЕ

Асновай для ацэнкі ўздзеяння гэтай стратэгіі будуць справаздачы па трохгадовых планах дзеянняў, у прыватнасці, дасягненне кантрольных паказнікаў і мэтаў, прадугледжаных у гэтых планах. У рамках гэтых справаздач, акрамя пералічаных вышэй паказчыкаў, таксама можна разгледзець апытанні Нацыянальных агенцтваў для вывучэння намаганняў і выклікаў на нацыянальным узроўні.

Акрамя вывучэння ўплыву стратэгіі, яе рэалізацыю можна падтрымаць ацэнкай і магчымымі парадамі па ўдасканаленні працы цэнтральных зацікаўленых бакоў стратэгіі, у прыватнасці, Рэсурснага цэнтру Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO.

3

ДАСЛЕДАВАННІ

Для паглыбленага вывучэння характару рэалізацыі Моладзевага пашпарту Youthpass і яго ўздзеяння праз некалькі гадоў ад пачатку рэалізацыі стратэгіі павінна быць праведзеным даследаванне ўздзеяння. Яго вынікі стануць трывалай асновай для далейшых разважанняў і дзеянняў. Можна разгледзець правядзенне другога даследавання ўздзеяння бліжэй да канца перыяду дзеяння стратэгіі.

Рэгулярныя маніторынгавыя апытанні RAY забяспечваюць каштоўную рэгулярную навуковую інфармацыю пра Youthpass і аспекты навучання і прызнання ў рамках дзвюх моладзевых праграмамі ЕС. Рэгулярныя апытанні могуць быць дапоўненыя даследаваннямі, прысвечанымі актуальным тэмам Моладзевага пашпарту Youthpass.

Таксама спатрэбяцца навуковыя ініцыятывы для выканання некаторых задач і роляў, апісаных у дадзенай стратэгіі, у прыватнасці для канцэптуалізацыі спантаннага характару навучання ў працы з моладдзю.

13

РАСПРАЦОЎКА СТРАТЭГІІ І ПАДЗЯКІ

Стратэгія Моладзевага пашпарту Youthpass была распрацаваная Рэсурсным цэнтрам Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO ў супрацоўніцтве з Еўрапейскай камісіяй. Праца ўключала кансультацыі з Кансультацыйнай групай Youthpass, Нацыянальнымі агенцтвамі і іншымі экспертамі па моладзевай працы, валанцёрстве, прызнанні і валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання.

Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO сардэчна дзякуе ўсім, хто спрычыніўся да распрацоўкі дадзенай стратэгіі шляхам удзелу ў кансультацыях. Мы спадзяёмся, што нам удалося пералічыць усіх удзельнікаў. Выбачайце, калі мы кагосьці прапусцілі. Мы дзякуем:

Adele Tinaburri, Alexandre Fonseca, Alice Dartout, Andrea Casamenti, Anita Silva, Annamaria Simeone, Annina Kurki, Antonella Rocchi, Barnabás Gulyás, Beata Pankowska, Christiane Westenhöfer, Daniele Nubile, Darko Markovic, Davide Dave Fumi, Denise De Stena, Deniss Jershov, Dita Čudare, Elisa Scardoni, Enrico Elefante, Estelle Crochu, Evelina Kvartunaite, Gabriela Salgado, Gabriella Civico, Giséle Evrard Markovic, Gry Nesse, Hans-Georg Wicke, Heiki Viisimaa, Igor Spetič, Ilaria Mardocco, Ildikó Gulácsi, Imre Töviskes, José Carlos Matos Martins, Judit Lantai, Karin Persdotter, Karmen Murn, Laura Liachovič, Lenka Havrdová, Lidia Greco, Mafalda Morganti, Manfred Zentner, Mara Arvai, Marietta Balazs, Mark Taylor, Matija Blaće, Meta Brečić-Ločičnik, Michala Velingerová, Michelangelo Belletti, Milena Butt-Posnik, Milos Popic Svitac, Nerijus Kriauciunas, Neslihan Noyan, Nik Paddison, Nikolina Garaca, Óli Örn Atlason, Paul Kloostermann, Pauline Boivin, Petra Jazbec, Rita Bergstein, Roberta Lanzalaco, Ronja Höfers, Salvi Greco, Sara Bertoli, Sari Höylä, Sergio Andrea Rilievo, Sérgio Gonçalves, Simona Molari, Snezana Baclija Knoch, Stanislavs Babins, Suzanne Kavanagh, Tanya Basarab, Valerija Posavec, Virginia Hernandez, Vojislava Tomic, Yunus Denizli, Ziga Magjar.

Стратэгія распрацаваная Крысцінай Пэрніц, Эдай Бакір і Гансам-Георгам Віке з Рэсурснага цэнтру Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO @ JUGEND für Europa пры падтрымцы калегаў з аддзелу EAC/B3 Еўрапейскай камісіі.

Youthpass

ІНФАРМАЦЫЯ ПРА ПУБЛІКАЦЫЮ

Апублікавана
JUGEND für Europa/
Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO,
Godesberger Allee 142 – 148, 53175 Бон, Германія
www.salto-youth.net

Адказны за публікацыю
Ганс-Георг Віке (Hans-Georg Wicke)

Каардынацыя публікацыі
Крысціна Пэрніц (Kristiina Pernits),
→ pernits@jfemail.de

Карэктура
Карын Ўокер (Karin Walker), Бон

Ілюстрацыі і макет
Ёнг і Мандзі Крунэ (Jörg and Mandy Krühne),
→ www.kreativraum.de
Крыніца выяваў, → www.unsplash.de

Юрыдычны прадстаўнік
IJAB – Міжнародная моладзевая служба Федэратыўнай Рэспублікі Германія

Дата публікацыя Стратэгіі: жнівень 2021 года.
Публікацыя была суфінансаваная праграмамі Еўрапейскага саюзу Erasmus+ і Еўрапейскі корпус салідарнасці. Еўрапейская камісія не нясе адказнасць за любое выкарыстанне інфармацыі, якая змяшчаецца ў гэтай публікацыі.

Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO падтрымліваецца Jugend für Europa, які працуе ад імя Федэральнага міністэрства па справах сям'і, пажылых людзей, жанчын і моладзі (BMFSFJ), і Еўрапейскай камісіяй.

Беларускі пераклад

Пераклад гэтага выдання на беларускую мову падтрымала → Праграма занятасці і прадпрымальнасці моладзі EU4Youth, якую разам прафінансавалі Еўрапейская Камісія і Міністэрства замежных спраў Літвы, супольна з → Рэсурсным цэнтрам Усходняй Еўропы і Каўказа SALTO.

Перакладчык

Алесь Лагвінец

Карэктар

Аляксей Дзеніс

JUGEND für Europa

Bundesministerium für Familie, Senioren, Frauen und Jugend

Co-funded by the European Union

CPVA Central project management agency

MINISTRY OF FOREIGN AFFAIRS REPUBLIC OF LITHUANIA

LTAID

SALTO EASTERN EUROPE & CAUCASUS

9 783982 689708